**Прамая лінія**

## Анкадыягназ — яшчэ не прысуд

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожнае трэцяе жыццё на Зямлі забірае рак. На яго хварэюць нават дзеці. Рэакцыя на гэты дыягназ заўсёды аднолькавая — жах, безвыходнасць. Аднак на праблему можна паглядзець і з іншага боку. І дапаможа нам у гэтым **галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкадыспансэра, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Зігмунд Эдуардавіч ГЕДРЭВІЧ**. Мы запрасілі яго на чарговую «прамую лінію», якая адбудзецца **24 жніўня ў аўторак з 12.00 да 13.30** па нумарах **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: **8 (017) 287 18 36 і 287 17 57**.

## Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю былога Прэзідэнта Італіі Франчэска Касігі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Італьянскай Рэспублікі Джорджа Напалітана і ўсяму народу Італіі ў сувязі са смерцю былога Прэзідэнта Італьянскай Рэспублікі сенатара Франчэска Касігі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«У Рэспубліцы Беларусь з вялікім болем і смуткам успрынялі паведамленне аб смерці былога Прэзідэнта Італьянскай Рэспублікі сенатара Франчэска Касігі, з імем якога звязаны шэраг важных для абедзвюх краін падзей, і перш за ўсё — устанаўленне беларуска-італьянскіх дыпламатычных адносінаў», — гаворыцца ў спачуванні.

## СТАРШЫНЯ РАЙВЫКАНКАМА Ў ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ СТАЎ ФІГУРАНТАМ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ АБ НЕЗАКОННЫМ ВЫДЗЯЛЕННІ ЗЯМЛІ

**Крымінальная справа па факце незаконнага выдзялення зямельных участкаў заведзена ў дачыненні да старшыні аднаго з раённых выканаўчых камітэтаў Віцебскай вобласці, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Чыноўнік падпісаў рашэнне райвыканкама аб выдзяленні двух зямельных участкаў агульным коштам больш як Br40 млн у пажыццёвае спадчыннае валоданне двум грамадзянам, нягледзячы на тое, што заканадаўствам вызначаны іншы парадак выдзялення зямельных участкаў. Як лічыць следства, яго дзеянні былі выкліканы асабістай зацікаўленасцю. Дзеянні старшыні райвыканкама пападаюць пад ч. 3 арт. 426 Крымінальнага кодэкса РБ «Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў», які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 10 гадоў. З пачатку года па матэрыялах службы барацьбы з эканамічнымі злачынствамі заведзена больш як 200 крымінальных спраў па фактах карупцыйных злачынстваў. З іх значную колькасць складаюць службовыя падлогі, крадзяжы шляхам злоўжывання службовым становішчам, хабары. Найбольшая колькасць карупцыйных злачынстваў выяўляецца ў органах дзяржкіравання, гандлі, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, транспарце і камерцыйных арганізацыях.

**Сацыяльныя стандарты**

## А ДА АПТЭКІ — 17 КІЛАМЕТРАЎ!

**Пра ўкараненне сацыяльных стандартаў вельмі любяць рабіць справаздачы мясцовыя чыноўнікі, начальнікі розных камітэтаў, упраўленняў. А ці адпавядаюць гэтыя самыя стандарты патрабаванням людзей, рэаліям часу? Аказваецца, не заўсёды.**

Вось, у прыватнасці, работнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці зрабілі выснову, што асобныя зацверджаныя сацыяльныя стандарты не адпавядаюць патрабаванням насельніцтва. Напрыклад, усярэднены нарматыў па забяспечанасці аптэкамі не прадугледжвае рэальнай магчымасці набыцця насельніцтвам лекавых сродкаў. Міністэрствам аховы здароўя не зацверджаны для фельчарска-акушэрскіх пунктаў спіс лекавых сродкаў. У выніку гэтага самі работнікі ФАПа вызначаюць, якія віды лекаў павінны быць (рознічная рэалізацыя лекаў акрамя аптэк арганізавана і ў ФАПе). А вось у Сініцкім ФАПе Бешанковіцкага раёна не прадаюцца лекі, пры ўсім тым, што бліжэйшая аптэка знаходзіцца за 17 кіламетраў ад аграрнага гарадка.

Кантралёры ўстанавілі, што з года ў год не выконваюцца асобныя нарматывы ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Так, напрыклад, у Полацкім і Бешанковіцкім раёнах дрэнная якасць вады. У прыватнасці, у Полацкім раёне 84 працэнты ўзятых проб вады не адпавядалі нарматыўным патрабаванням па ўтрыманні жалеза. Асноўная прычына — адсутнасць на водазаборных збудаваннях станцый абезжалезвання. Пабудаваныя яшчэ ў 2005—2006 гадах на тэрыторыі раёна 4 з 5 станцый абезжалезвання не функцыянуюць. Яны не прынятыя ў эксплуатацыю. А ў аграрным гарадку Жарнасекі такая станцыя, пабудаваная ў 2007-м, да нармальнага эксплуатацыйнага рэжыму не даведзена.

Адсутнасць цэнтралізаванай сістэмы водазабеспячэння і каналізацыі ў аграгарадках, на жаль, сумныя прыкметы і ў XXI стагоддзі. Напрыклад, у населеным пункце Рудня Полацкага раёна жыхары шасці з дзевяці шматкватэрных дамоў (прыкладна кожны пяты жыхар аграгарадка) бяруць ваду з водазаборных калонак, у калодзежах, карыстаюцца прыбіральняй на вуліцы. У большасці з правераных раёнаў комплексныя прыёмныя пункты працуюць як дыспетчарскія і гандлююць рытуальнымі «аксесуарамі». Чамусьці не выкарыстоўваецца набытае для комплексных прыёмных пунктаў швейнае абсталяванне. А для цырульняў толькі часткова. Напрыклад, у Лёзненскім раёне ў двух аграрных гарадках не выкарыстоўваюцца швейныя машыны, для выкарыстання цырульнага абсталявання не падключана вада.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЕЛАРУСКАЕ ВОЙСКА — УЖО НАПАЛОВУ ПРАФЕСІЙНАЕ

**Парламенцкі дзённік**

### Аднак рабіць яго такім на ўсе 100 адсоткаў, на думку старшыні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў Ігнацыя МІСУРАГІНА, немэтазгодна

**Пасля доўгіх баталій парламентарыі ўсё ж падтрымалі папраўкі ў закон аб воінскім абавязку і воінскай службе ў тым выглядзе, у якім ён паступіў ад распрацоўшчыкаў (Міністэрства абароны). З пазбаўленнем завочнікаў адтэрміноўкі. Апублікаваны 27 ліпеня, ён уваходзіць у дзеянне праз 10 дзён. Сённяшнім завочнікам давучыцца дадуць, а вось тым, хто наноў паступіў, рызыкуюць стаць навабранцамі вельмі хутка. Пагаворваюць, што ў далейшым такі лёс чакае не толькі завочнікаў: дэмаграфічную дзірку паветрам не залаташ... Чым харчавацца чуткамі, лепш запытацца ў спецыяліста. Пра чаканы эфект ад новага закона і магчымыя тэндэнцыі ў фарміраванні войска вядзём дыскусію з новым старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Ігнацыем МІСУРАГІНЫМ.**

***— Ну, добра, завочнікаў у войска выправілі. А ці вырашана праблема з недахопам прызыўнога кантынгенту?***

— Не думаю, што гэта канчаткова вырашыць праблему, аднак яна будзе насіць ужо іншы характар. Сёння ў Беларусі больш за 30 тысяч завочнікаў. Мы прааналізавалі, колькі з іх пасля атрымання вышэйшай адукацыі служаць. Там мізэрная доля: каля 14-16 адсоткаў. Некаторыя схітраюцца, не скончыўшы навучанне ў адным універсітэце, паступіць у другі, і так дацягнуць да 27 гадоў... Адтэрміноўкі ў нашай краіне — вельмі балючае месца. Беларусь — адна з нямногіх дзяржаў на прасторы СНД, якая мае такую колькасць адтэрміновак, каля 30. Ва Украіне і ў Расіі значна менш, я ўжо не кажу пра Малдову і Казахстан, дзе іх практычна няма. І ўлічваючы няпростую дэмаграфічную сітуацыю, было прынятае такое рашэнне па завочніках. Аднак гэта не значыць, што мы пазбаўляем іх права навучацца. Малады чалавек можа атрымаць адукацыю, праслужыўшы аднак пэўны час ва Узброеных Сілах. Былі складанасці па гэтым пытанні, але дэпутаты нас падтрымалі, думаю, і грамадзяне зразумеюць. Тым больш, што нам удалося вырашыць вельмі важную задачу — даць салдату тэрміновай службы адтэрміноўку па выплаце крэдыту на жыллё. Я лічу, гэта будзе вітацца і прызыўнікамі, і кіраўніцтвам баявых часцей. Мы спрабавалі гэтым законам павысіць прывабнасць службы ў войску. Удакладнілі пералік грамадзян, якія падлягаюць прыёму на воінскі ўлік, зняццю з воінскага ўліку. Гэта таксама вельмі важна. Выклалі ў новай рэдакцыі парадак здзяйснення дапрызыўнай падрыхтоўкі, фізічнай падрыхтоўкі і арганізацыі патрыятычнага выхавання моладзі. Новым законам мы замацавалі парадак заключэння кантрактаў аб праходжанні ваеннай службы з грамадзянамі, залічанымі ў ваенныя навучальныя ўстановы. Цяпер студэнты, якія навучаюцца на ваенных кафедрах, будуць прымаць прысягу па праграме малодшых камандзіраў. Замацоўваецца дакументам і парадак прысваення воінскіх званняў тым, хто мае спецыяльныя званні, — пры паступленні ці прызыве на ваенную службу.

***— А што далей — яшчэ большае скарачэнне колькасці адтэрміновак, павелічэнне прызыўнога ўзросту?***

— Гэта пытанне вывучаецца, у тым ліку і на самым высокім узроўні. Аднак тое, што мы будзем глыбока вывучаць кожную адтэрміноўку, кожнага прызыўніка, дык дакладна. Мы павінны клапаціцца пра нацыянальную бяспеку. У нашай Канстытуцыі запісана, што кожны малады чалавек павінен прайсці службу. Нам неабходны мабілізацыйны рэзерв: салдат тэрміновай службы залічаецца ў тыя ці іншыя падраздзяленні, якія разгортваюцца ў выпадку вайны. Мы будзем і надалей падтрымліваць цесныя сувязі з Міністэрствам абароны, і з Дзяржаўным пагранічным камітэтам, і іншымі ведамствамі, дзе праходзяць тэрміновую службу. Будзем вывучаць становішча спраў і спрабаваць уносіць адпаведныя праўкі.

***— Калі іх можна чакаць?***

— Праз год, верагодна. За гэты час мы пракатаем увесь закон — паглядзім, што напрацавалі, паслухаем прапановы ад войскаў.

***— Ці магчымы перагляд медыцынскіх падстаў для адтэрміноўкі?***

— Трапляючы на воінскі ўлік у 16 гадоў, хлопцы праходзяць абавязковы медыцынскі агляд, і пазней, напярэдадні прызыву, таксама. На жаль, наша моладзь сёння не тая, якую нам хацелася б бачыць — па стане здароўя, я маю на ўвазе. У многіх сур'ёзныя захворванні, якія не дазваляюць служыць. Гэта нас вельмі насцярожвае. Таму, рэгламентуючы ў законе дапрызыўную падрыхтоўку, мы закранулі і фізічную падрыхтоўку. Усё звязана: не займаешся фізпадрыхтоўкай, значыць, бегаць ты не можаш, скакаць не можаш, вынослівасцю не валодаеш. Мы вырашылі пайсці такім шляхам, бо павышаць медыцынскія патрабаванні да прызыўнікоў ужо няма куды...

***— Я чула пра абсурдныя выпадкі, калі праходзіць рэгулярны «дапрызыўны» медыцынскі агляд вымушаюць асобаў без лёгкага, нават без ног...***

— Такіх выпадкаў я не ведаю. Яны адразу атрымліваюць, як раней казалі, «белы» білет. Гэта могуць быць адзінкавыя выпадкі, мы не можам іх абагульняць.

***— Якая яна, рэформа войска па-беларуску? Ці магчымае ў нас скарачэнне тэрмінаў службы?***

— Тыя задачы, якія былі пастаўленыя Прэзідэнтам, кіраўніцтвам сілавых ведамстваў па рэфармаванні Узброеных Сілаў, пераважна выкананыя. Па сутнасці план будаўніцтва УС рэалізаваны. Аднак, як і любы план, ён патрабуе ўдасканалення. Таму гэта не азначае, што ўсё застыне і будзе ў статычным стане стагоддзямі. Пэўныя змены будуць і ў структуры, і ў арганізацыі баявой падрыхтоўкі, апаратыўна-тактычнай падрыхтоўкі — зыходзячы з найноўшых патрабаванняў, якія вылучае перад намі жыццё. Сказаць, ці будзе скарочаны тэрмін службы ў нашай краіне, вельмі няпроста. Пытанне гэтае прапрацоўваецца. Ведаю, што Расія робіць пэўныя спробы ў гэтым кірунку. У Германіі абмяркоўваюць магчымасць таго, каб салдаты служылі паўгода... Пытанне няпростае і патрабуе глыбокага вывучэння. Мая асабістая пазіцыя? Беларускі салдат служыць 18 месяцаў, думаю, гэтага дастаткова, каб падрыхтаваць грамадзяніна, патрыёта і спецыяліста ваеннай справы. Праўда, сёння зусім не тыя салдаты, што былі 10—15 гадоў таму: яны больш адукаваныя і падрыхтаваныя. Таму трэба глыбока вывучаць усе магчымыя варыянты.

***— Ці бярэ камісія ўдзел у распрацоўцы законапраекта аб альтэрнатыўнай службе?***

— Альтэрнатыўная служба адносіцца да сацыяльнай абароны і пакуль у профільную камісію такі законапраект не паступаў. Што датычыцца нашага ўдзелу, то, безумоўна, у яго разглядзе мы возьмем самы актыўны ўдзел. Асаблівых праблем для распрацоўкі гэтага закона я не бачу. Праблема будзе ў механізме яго рэалізацыі. Мы проста не вывучалі гэта пытанне, у нас няма практыкі. Аднак у Канстытуцыі гэта замацавана, таму такі законапраект павінен быць. Мяркую, да канца гэтага года ён будзе распрацаваны. Магу сказаць з уласнага вопыту службы, што колькасць людзей, якія па рэлігійных меркаваннях адмаўляюцца браць у рукі зброю, — мінімальная. Таму наўрад ці гэты закон істотна зменіць сітуацыю па прызыве.

***— Калі хлопцаў не хапае, можа ўжо і дзяўчатам час турбавацца — а раптам і нас пачнуць прызываць, як у Ізраілі?***

— Ва Узброеных Сілах Беларусі ўжо цяпер дастаткова шмат жанчын — каля дзвюх тысяч. Аднак не думаю, што гэта трэба ўзводзіць у ранг дзяржаўнай палітыкі. Мы, дзякуй Богу, не ў Ізраілі, які ваюе, і я не хацеў бы, каб беларускія жанчыны нароўні з мужчынамі служылі ў войску. Жанчыны маюць свой спецыфічны лад жыцця, сваю асаблівую ролю, некалькі несупастаўляльную з тымі задачамі, якія вырашаюцца ва Узброеных Сілах. Жанчыны павінны займацца іншымі справамі.

***— Ці магчымы ў Беларусі пераход да цалкам прафесійнага войска?***

— Я адкажу пытаннем на пытанне. Ці ёсць эканамічная база для гэтага, па-першае? А па-другое, ужо сёння амаль палова нашых Узброеных Сілаў — гэта прафесіяналы: вайскоўцы па кантракце, прапаршчыкі, афіцэры. Атрымліваецца, напалову прафесійнае войска ў нас. 100 адсоткаў прафесіяналаў у войску — пакуль вельмі цяжка для дзяржавы з пункту гледжання эканомікі. Тым больш, мы бачым няўдалыя прыклады пераходу да прафесійнага войска: усе ведаюць, якія праблемы сустрэлі амерыканцы ў Іраку, Афганістане і іншых гарачых пунктах. Ды і ўвогуле немэтазгодна гэта, павінен быць змешаны прынцып камплектавання — каб кожны разумеў сваё грамадзянскае прызначэнне.

***— Маладыя людзі часта спасылаюцца на тое, што на сваім, грамадзянскім, месцы яны прынясуць большую карысць — рухаючы наперад навуку, вытворчасць, папаўняючы дзяржаўную скарбонку. Як лічыце, некалі стане магчымым такі варыянт, калі б бліскучаму спецыялісту ці, напрыклад, паспяховаму бізнэсмену дазволілі заплаціць за тое, каб у войску замест яго тыя 18 месяцаў служыў прафесіянал?***

— Гэта выключана. Няправільны гэта падыход, на мой погляд. Кожны грамадзянін павінен прайсці ваенную службу і даручаць гэта, прабачце за выраз, наёмніку... я лічу, няправільна. Пеця не пайшоў, а Ваня павінен адслужыць за яго?! А самі вы як лічыце, што такія пытанні задаяце?

***— Я непакоілася б за свайго брата ці сябра — з-за дзедаўшчыны і іншых жудасцяў, якія мы чуем пра войска...***

— Усе гэтыя жахі перабольшаныя, я лічу. Стан воінскай дысцыпліны ва Узброеных Сілах выдатны. Статыстыка сведчыць, што праваапарушэнняў з кожным годам усё менш. Проста няма той базы, на якой расла б злачыннасць. Калі 15—20 гадоў таму такія ўсплёскі маглі быць, то сёння, я лічу, нармальнае становішча, якое дазваляе салдату тэрміновай службы спакойна, размерана займацца сваё справай — баявой падрыхтоўкай, нясеннем службы.

***— Баявой падрыхтоўкай? А кажуць, большую частку часу салдат праводзіць за мяценнем двароў і фарбаваннем бардзюраў...***

— Відавочна, гэта гавораць тыя, хто пра войска ведае толькі па чутках. Так, былі пэўныя задачы, і яны застануцца, аднак баявая падрыхтоўка — гэта планавыя мерапрыемствы, таму 8, а то і ўсе 10 гадзін планавай вучобе салдат павінен прысвячаць кожны дзень! Вядома ж, пакуль мы не можам сабе дазволіць, каб утрыманнем усіх аб'ектаў на тэрыторыі вайсковых часцей займаліся іншыя службы. Аднак у Міністэрстве абароны створаныя структуры, якія гэтым пытаннем займаюцца. Вось нядаўняе рашэнне — перадаць салдацкія сталоўкі ў ведамства Ваенсэрвіса, каб вызваліць салдат ад абавязкаў па кухні, а ахову часцей і аб'ектаў — ваенізаванай ахове. Ды гэта датычыцца не толькі сталовак, але і іншых частак абслугоўвання.

***— Ці ёсць у Вас, Ігнацій Арцёмавіч, асабістыя заканадаўчыя ініцыятывы? За што змагаецеся Вы самі?***

— Назіраю, як істотна лібералізуецца апошнім часам крымінальнае заканадаўства, ваенная ж яго частка нібы адстала. Прапаноўваю папраўкі ў Крымінальны кодэкс, якія павінны ліквідаваць гэты дысбаланс. Калегі мяне падтрымліваюць, на Савеце Палаты было вырашана рэкамендаваць адпаведны законапраект для ўключэння ў праект Плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2011 год. У чым сутнасць прапанаваных мною паправак? Я лічу, што мы павінны адысці ад пакарання ў выглядзе накіравання ў дысцыплінарны батальён. Магчыма, замяніць арыштам на гаўптвахце ці ўвядзеннем штрафаў. І разгрузіць тым самым дысбат, які мае мінімальную колькасць асуджаных і празмерна вялікі персанал для іх утрымання. Папраўкі ўнесены на разгляд у Генпракуратуру і іншыя зацікаўленыя ведамствы, праведзена пашыранае пасяджэнне рабочай групы па гэтым законапраекце. Разуменне яго важнасці і неабходнасці ёсць ва ўсіх удзельнікаў рабочай групы. Думаю, ён атрымае правільную ацэнку нашых вайскоўцаў. Іх меркаванне таксама будзе прынятае да ўвагі. Разлічваю, што гэты закон з'явіцца ў 2011 годзе.

*У які бок ні рэфармавалася б беларускае войска, хочацца ўсё ж, каб яно пакідала маладым людзям права выбару. І каб выбар гэты быў іх асабістым, а галоўнае — усвядомленым.*

**Ала МАЧАЛАВА.**

**Абзац**

◢ **Споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага паэта Алеся Жаўрука. Яго лірычнае слова абарвалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Паэт паспеў выдаць толькі два паэтычныя зборнікі. Армейскі журналіст Алесь Жаўрук ваяваў пад Сталінградам побач з сынам Далорэс Ібаруры. Абодва загінулі ў 1942 г. падчас абароны горада.**

◢ У Беларусі ў студзені—чэрвені гэтага года, паводле статыстыкі, на 1000 шлюбаў прыпадалі 593 разводы. Для параўнання: у студзені—чэрвені 2009 года на 1000 заключаных шлюбаў было 555 скасаванняў сямейных саюзаў.

◢ **У Гомельскай вобласці ўчора ноччу кіроўца заснуў за рулём свайго аўтамабіля і трапіў у ДТЗ. Аварыя адбылася на 252-ім кіламетры аўтадарогі Мінск—Гомель. Сужэнцы — жыхары Мінска — разам з дачкой вярталіся на сваім аўтамабілі з Крыма, дзе сям'я адпачывала. Кіроўца заснуў падчас руху, з-за чаго аўто з'ехала ў кювет і перакулілася. Дачка 2003 г.н. памерла ад атрыманых раненняў. Па звестках ДАІ, кіроўца працуе майстрам вытворчага ваджэння ў адной з аўташкол Мінска.**

◢ Цягнік з Масквы ў Ніцу пачне курсіраваць у верасні праз Беларусь. Маршрут цягніка будзе праходзіць праз гарады Вязьма, Смаленск, Орша, Мінск, Брэст, Тэрэспаль, Варшава, Зебжыдавіцэ, Бржэцлаў, Вена, Лінц, Інсбрук, Бальцана, Верона, Мілан, Генуя, Сан-Рэма, Бордзігера, Вентыміль і Ментон. Цягнік будзе курсіраваць адзін раз на тыдзень, адпраўляючыся з Беларускага вакзала Масквы па чацвяргах з прыбыццём у Ніцу ў суботу. У Мінск ён будзе прыбываць у пятніцу ў 0.59.

**Поўны абзац**

◢ **У Вінніцкай вобласці Украіны інспектара дарожна-патрульнай службы звольнілі за зняважлівае стаўленне да вадзіцеля. 10 жніўня ў інтэрнэце быў размешчаны відэаролік, на якім зафіксаваная слоўная перапалка паміж аўтаінспектарам і аўтамабілістам. Размова на павышаных абаротах скончылася тым, што інспектар паказаў кіроўцу кукіш. Менавіта гэтае відэа паслужыла падставай да службовай праверкі, якая прывяла да звальнення. Як паведамілі ў аддзеле сувязяў з грамадскасцю ГУ МУС Украіны ў Вінніцкай вобласці, інспектара адхілілі ад пасады з-за некарэктных і зняважлівых стасункаў.**



◢ Англійскія рыбакі аплакваюць люстранога карпа па мянушцы Двухколерны, верачы, што ён быў самай вялікай праснаводнай рыбінай Вялікабрытаніі. Карп, які важыў пад 32 кг, быў выяўлены на паверхні возера ў графстве Кент, дзе і жыў. Як мяркуецца, яму было 45 гадоў і памёр ён ад старасці. Рыбакам удавалася злавіць рыбіну толькі 1-2 разы за год і не больш за 50 разоў за ўсё яго жыццё, што рабіла Двухколернага асабліва прывабным у вачах вудзільшчыкаў. Многія рыбакі былі настолькі апантаныя ідэяй злавіць славутага карпа, што яго жартам пачалі называць «разбуральнікам шлюбаў». «Гэта стала сапраўдным азартам, — расказаў рыбак Лі Джэксан, які напісаў цэлую кнігу пра свае пошукі легендарнай рыбіны. — Я выходзіў вудзіць вясной, летам і восенню, не выпускаў вуду па 50 гадзін у тыдзень. Мне спатрэбілася 6 гадоў, каб злавіць яго на кручок».

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## НА СТАЛІЧНЫМ ХЛЕБАЗАВОДЗЕ № 2 СТВОРАЦЬ ЭКСКУРСІЙНУЮ ЗОНУ

Вакол хлебапякарнай вытворчасці плануецца наладзіць празрыстую галерэю, дзе будуць праводзіцца экскурсіі. Такім чынам наведвальнікі змогуць даведацца пра гісторыю хлебапячэння і ў той жа час назіраць, як выпякаецца хлеб. Плануецца таксама арганізаваць невялікія кавярні, бары. Акрамя таго, тут з'явіцца старадаўняя пякарня, дзе будуць гатаваць заварны хлеб па бабуліных рэцэптах.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

**Фонд «Могилевоблимущество» информирует**

Аукцион по продаже находящихся в республиканской собственности принадлежащих на праве хозяйственного ведения республиканскому унитарному предприятию «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» четырех изолированных помещений, расположенных по адресу: г. Могилев, ул. Вишневецкого, д. 8а, назначенный на **11.00 25 августа 2010 г.,** извещение о проведении которого было опубликовано в газете «Звязда» 24 июля 2010 г., отменяется.

*УНП 700052050.*

**Вниманию акционеров Открытого акционерного общества «Столичный проспект»**

Приглашаем Вас принять участие в общем собрании акционеров ОАО «Столичный проспект» **21 сентября 2010 года**. Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, дом культуры ОАО «Жабинковский сахарный завод». Регистрация участников собрания с 12.30 до 12.45 по месту проведения собрания. Начало работы собрания 21 сентября 2010 года в 13.00.

**Повестка дня собрания:**

1. О направлениях использования чистой прибыли на 2010 год и 1 квартал 2011 года.
2. Об основных направлениях деятельности Общества в 2010 году.
3. О назначении вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни с 10 по 20 сентября 2010 года с 09.00 по 16.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Титова, 3.

УНП 290984478

# ЖЫЦЦЁ Ў КРЭДЫТ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Але вернемся да сям'і маёй сяброўкі. Пасля няўдалай спробы ўзяць крэдыт на пакупку маршруткі прайшло два месяцы. Колькасць і памер даўгоў у іх, на шчасце, паціху змяншаецца. Больш за тое, месяц таму яны набылі аўтамабіль. Прычым абышліся без крэдыту. Праўда, гэта не «Фальксваген LT-35» 2005 года выпуску, а «Фіят-Брава» 1995 года. Гэта ўжо не для бізнэсу, а для сям'і, каб было на чым дачку ў школу вазіць, бо абставіны склаліся так, што яна будзе хадзіць у школу, якая знаходзіцца ў іншым раёне горада. Аўто каштавала ім 2000 долараў, якіх у іх, зноў жа, не было, але прадавец пагадзіўся прадаць «Фіят» у растэрміноўку. Некалькі дзён муж маёй сяброўкі быў зусім шчаслівы. Бо пра ўласную машыну ён марыў усё сваё жыццё. Але хутка ён зразумеў, што не новае аўто патрабуе ўкладанняў, і чым больш своечасова яны зробленыя, тым меншыя атрымоўваюцца па суме. Вось ён і вырашыў шукаць цяпер крэдыт на тое, каб да верасня замяніць колавыя і тармазныя дыскі, тармазныя калодкі, падшыпнік і шрусы, а таксама паспець да зімы пакрыць днішча антыкаразійным пакрыццём.

Размова ідзе не пра не нейкі спецыяльны крэдыт, а звычайны — спажывецкі. Заставалася толькі зноў знайсці банк, які пагадзіўся б даць такі крэдыт нягледзячы на нізкі (450 тысяч) афіцыйны заробак і наяўнасць дзяцей.

— Гэта аказалася лягчэй, — расказвае мая сяброўка. — Мы нават выбіралі паміж двума банкамі. Нарэшце ў адзін з іх занеслі дакументы і цяпер чакаем званка. Праўда, банк нас папярэдзіў, што мае права адмовіць у крэдыце без тлумачэння прычын. Але мы спадзяёмся, што хутка будзем мець патрэбныя нам тры мільёны рублёў.

На такую суму дае крэдыт, напрыклад, Абсалютбанк пры заробку 650 тысяч рублёў (пры меншым заробку — меншая сума крэдыту, але заробак павінен быць не менш за 350 тысяч). Тэрмін крэдыту — 12 месяцаў, стаўка — 13 працэнтаў гадавых. Праўда, гэта — не ўсё. Штомесячная плата за суправаджэнне крэдыту (акрамя платы асноўнай пазыкі і працэнтаў) складае ад 13 да 42 тысяч штомесяц у залежнасці ад сумы крэдыту, плата за разгляд пакета дакументаў — 42 тысячы, і плата за выдачу наяўных грошай (яе бяруць пры выдачы крэдыту) — 2 працэнты ад узятых у банку грошай.

Няма канкрэтных абмежаванняў у плане заробку і для атрымання спажывецкага крэдыту ў Дэльта-Банку. Для атрымання грошай на пластыкавай картцы даведка аб даходах тут увогуле не патрабуецца. Працэнтная стаўка ў гэтым выпадку — 15 працэнтаў гадавых, плюс штомесячная камісія за суправаджэнне крэдыту (з адтэрміноўкай у тры месяцы) — 3,5 працэнта той сумы, якую кліент павінен банку на дадзены момант. Тэрмін крэдыту — 3 гады, сума пазыкі — ад 1 да 5 мільёнаў.

Увогуле, спажывецкія крэдыты банкі прапануюць на самых розных умовах. Напрыклад, той жа Дэльта-Банк дае грошы на набыццё бытавой тэхнікі, мэблі, вокнаў і дзвярэй, газавага абсталявання, будаўнічых матэрыялаў, мабільных тэлефонаў, партатыўнай электронікі, ноўтбукаў, аўдыё-, відэа- і іншых тавараў, а таксама на паслугі касметалогіі, стаматалогіі, турызму, адукацыі, страхавання «АўтаКАСКА» і рамонт жылля. Працэнтная стаўка — 10 пунктаў у год, камісія — 2,3-2,7 працэнта ад сумы крэдыту штомесяц, сума — ад 300 тысяч да 10 мільёнаў, тэрмін — ад 3 месяцаў да года. Праўда, такі крэдыт даецца толькі пры афармленні дагавора добраахвотнага страхавання жыцця, які заключаецца з пэўнай страхавой кампаніяй.

Без даведкі аб даходах дае крэдыт на суму да 3 мільёнаў рублёў наяўнымі грашыма і Міжнародны рэзервовы банк. Праўда, калі сума крэдыту больш за 1,5 мільёна, патрабуюцца паручыцелі. Да канца верасня ў гэтым банку дзейнічае акцыя, у рамках якой можна атрымаць крэдыт пад 9 працэнтаў гадавых. Зразумела, гэта не ўсе грошы, якія трэба будзе пераплачваць, бо штомесячная камісія за суправаджэнне крэдыту тут складае 4 працэнты ад сумы пазыкі. Тэрмін крэдыту — ад паўгода да трох гадоў.

Спецыяльную акцыю па спажывецкім крэдытаванні аб'явіў і «Банк Масква-Мінск». З 1 жніўня па 30 верасня тут можна аформіць крэдыты без платы за... афармленне. Праўда, даход улічваецца, і ад яго залежыць сума грошай, якія банк гатовы пазычыць. Банк можа таксама ўлічыць даходы мужа, жонкі, дзяцей і бацькоў. Тэрміны крэдыту — ад 1 да 6 гадоў, працэнтная стаўка — ад 10 (для тых, хто ўжо мае крэдыт у гэтым банку і своечасова яго пагашае) да 18 працэнтаў, штомесячная плата за суправаджэнне — ад 29 да 99 тысяч рублёў (у залежнасці ад сумы пазыкі). Плата за атрыманне наяўных грошай альбо не бярэцца зусім, альбо складае 2 працэнты ў залежнасці ад віду крэдыту. Там, дзе працэнтная стаўка ніжэйшая, трэба будзе заплаціць за выдачу крэдыту, такім чынам банк, любы, усё роўна сваё возьме.

Дарэчы, гэтая мая знаёмая, як і я сама, ужо выплачвае крэдыт на нерухомасць. Умовы майго крэдыту — 3 працэнты гадавых (з іх палову пагашае дзяржава) на 40 гадоў, яе — 15 працэнтаў на 20 гадоў. Абодва крэдыты льготныя, узятыя ў «Беларусбанку».

Літаральна пазаўчора, 18 жніўня, Белаграпрамбанк» знізіў працэнтныя стаўкі па крэдытах па наноў заключаных дагаворах. Цяпер у гэтым банку можна ўзяць крэдыт на будаўніцтва жылля пад 14 працэнтаў гадавых тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і пад 17 працэнтаў гадавых тым, хто такім не лічыцца. Тэрмін — да 20 гадоў. Максімальная сума крэдыту — 300 мільёнаў рублёў, або не больш за 80 працэнтаў ад кошту жылля.

«Пріорбанк» таксама крэдытуе не больш за 80 працэнтаў ад кошту жылля, а сума крэдыту тут залежыць ад сукупнага даходу сям'і. Стаўка — 18 працэнтаў гадавых. Тэрмін можа быць розны.

Да 75 працэнтаў ад кошту жылля гатовы крэдытаваць «Беларусбанк». «Чаргавікі» могуць разлічваць на стаўку 14,5 працэнта (у сельскай мясцовасці — 13,5) і тэрмін да 20 гадоў, астатнія — на 21 працэнт гадавых і тэрмін крэдытавання да 15 гадоў.

* * *

**Я спрабавала адгаварыць сваю сяброўку браць крэдыт на рамонт аўтамабіля. Мне проста стала яе шкада. Кажу, збяры грошы і тады рамантуй. А яна: «Навошта ж машыну тады купілі? І дзіця трэба ў школу вазіць...» Што тычыцца мяне, то ўзяўшы аднойчы ажно два крэдыты, каб хутчэй скончыць рамонт у кватэры, і датэрмінова іх пагасіўшы, я ўсімі сіламі стараюся падобнай практыкі пазбягаць. Няма грошай, кажаце? Дык навошта ж тады плаціць яшчэ большыя, чым аддаяце за рэч або паслугу? Ну добра яшчэ, кватэра або вучоба. Гэту справу не адкладзеш. Як само жыццё. А астатняе можа пачакаць. Не, я не вучу. Гэта я кажу сама сабе. Бо цяжка жыць, калі амаль увесь заробак альбо добрую яго частку трэба аддаць. Жыццё тады робіцца больш напружаным, чым было без той рэчы, дзеля якой ты залез у ярмо. Але нікога са знаёмых мне пакуль не ўдалося ў гэтым упэўніць. На чужых памылках, кажуць, не навучышся.**

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## У ФЕДЭРАЦЫІ ХАКЕЯ З'ЯВІЎСЯ ГЕНЕРАЛЬНЫ СПОНСАР

**«Пріорбанк» стаў генеральным спонсарам беларускай федэрацыі хакея. Адпаведнае пагадненне падпісана 19 жніўня на тэрмін да 2014 года. Паводле слоў старшыні праўлення ААТ «Пріорбанк» Сяргея Касцючэнкі, гаворка ідзе аб сотнях мільярдаў рублёў. Сёлета федэрацыя хакея атрымае 250 мільёнаў рублёў.**

Як адзначыў Сяргей Касцючэнка, банк яшчэ падчас свайго стварэння, у 90-х, вызначыўся, што дапамагаць будзе тым, хто сам не можа зарабіць. Адным з напрамкаў быў абраны спорт. «Вылучаючы грошы пад клубныя каманды, чэмпіянаты свету, мы падтрымліваем спорт вышэйшых дасягненняў. Але за ім стаіць моладзь. І наша задача — прапанаваць маладым людзям альтэрнатыву шкодным звычкам у выглядзе здаровага ладу жыцця, адцягнуць яе ад вуліцы», — заўважыў Сяргей Касцючэнка.

Дамова аб спонсарскай падтрымцы разлічаная і на чэмпіянат свету-2014, які прыме наша краіна. Як адзначыў старшыня федэрацыі хакея Яўген Ворсін, толькі на арганізацыйныя моманты — размяшчэнне і харчаванне камандаў, транспарт, арганізацыю матчаў — патрэбныя каласальныя затраты, каля 13-15 мільёнаў еўра. Дзяржаўнага фінансавання на такую падрыхтоўку не будзе. Як адзначыў Сяргей Касцючэнка, яшчэ на папярэдняй стадыі, калі прымалася рашэнне аддаць чэмпіянат свету нашай краіне, ён сустракаўся з кіраўніцтвам Міжнароднай федэрацыі хакея і даў адпаведныя фінансавыя гарантыі.

На пытанне, наколькі выгадна такое спонсарства «Пріорбанку», Сяргей Касцючэнка адзначыў: «Як бізнэсмен магу сказаць, што банк, безумоўна, на гэтым заробіць. Але ці акупіць гэта выдаткі? Наўрад ці». Яўген Ворсін заўважыў, што спонсарская дапамога будзе выкарыстана эфектыўна: «Яна не пойдзе на заработныя платы і растранжыраная не будзе, гэтыя грошы — на рэальныя праекты». Пакуль частка сродкаў пойдзе на падтрымку і падрыхтоўку нацыянальнай зборнай.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# НА АРФАГРАФІЧНЫЯ ПАМЫЛКІ Ў РАБОТАХ ШКОЛЬНІКАЎ АБВЕШЧАНЫ ТРОХГАДОВЫ «МАРАТОРЫЙ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Казімір Фарыно падкрэсліў, што ён катэгарычна не згодны са сцвярджэннем, што «беларуская мова ў нас у заняпадзе». На карысць сваёй думкі ён прывёў статыстыку сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання. Так, на абавязковым экзамене па адной з дзвюх дзяржаўных моў беларускую мову абралі 67 тысяч абітурыентаў, праўда, рускую мову пайшлі здаваць 105 тысяч чалавек, хоць яшчэ некалькі гадоў таму і на беларускую, і на рускую мову рэгістравалася прыкладна аднолькавая колькасць маладых людзей. Здаваць фізіку на беларускай мове пажадалі 3 тысячы чалавек, матэматыку — 7 тысяч, біялогію — каля 3 тысяч і гісторыю Беларусі — каля 9 тысяч чалавек (з больш чым 25 тысяч, хоць калісьці выкладанне гэтай дысцыпліны вялося толькі на беларускай мове. — «Звязда»).

Казімір Фарыно паведаміў, што ў 43 працэнтах агульнаадукацыйных устаноў нашай краіны навучальны працэс ажыццяўляецца на рускай мове, у 52 працэнтах — на беларускай мове і 118 школ практыкуюць двухмоўе. Разам з тым, намеснік міністра адукацыі быў вымушаны прызнаць, што выкарыстанне ў навучальным працэсе беларускай мовы характэрнае для сельскіх малакамплектных школ, таму, калі глядзець на напаўняльнасць такіх устаноў, то атрымліваецца, што 77 працэнтаў беларускіх школьнікаў навучаюцца на рускай мове, а на роднай мове атрымліваюць адукацыю толькі 18 працэнтаў ад агульнай колькасці вучняў. «Выбар мовы навучання цалкам залежыць ад жадання і попыту бацькоў, — запэўніў Казімір Фарыно, — з нашага боку няма ніякага ціску. Усе пытанні захавання балансу ў вывучэнні беларускай і рускай мовы і літаратуры для нас вельмі важныя».

Паведаміў Казімір Фарыно таксама і яшчэ пра адно важнае новаўвядзенне — у беларускіх школах у новым навучальным годзе павінна з'явіцца дадатковая гадзіна ў тыдзень для вывучэння замежных моў. Як вядома, перад агульнаадукацыйнай школай пастаўлена задача навучыць выпускнікоў хоць бы гутарковай замежнай мове, а праз два гады ўвесці для іх па замежнай мове абавязковы выпускны экзамен. Аднак пры дзвюх гадзінах у тыдзень якасна павысіць засваенне замежнай мовы, зразумела, праблематычна.

— Таму нядаўна было прынятае рашэнне аб тым, каб змяніць вучэбны план і дапоўніць яго трэцяй гадзінай, прызначанай для вывучэння замежнай мовы, — патлумачыў Казімір Фарыно. — Дадатковая гадзіна з'явіцца ва ўсіх класах — з 3-га па 11-ы. У гімназіях, дзе раней на вывучэнне замежнай мовы адводзіліся тры гадзіны ў тыдзень, таксама з'явіцца дадатковая гадзіна. Да таго ж яшчэ ў чэрвені было прынятае рашэнне аб раздзяленні ўсіх класаў на тры падгрупы на ўроках замежнай мовы. Гэта мае прынцыповае значэнне для развіцця гутарковых навыкаў у школьнікаў: у настаўніка амаль удвая павялічваецца час для непасрэдных стасункаў з кожным вучнем у групе. А ў выкладчыкаў замежных моў павялічыцца ў новым навучальным годзе педагагічная нагрузка, і адпаведна, іх заробкі.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**

**Кантынгент навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў скароціцца ў новым навучальным годзе на 33 тысячы чалавек.**

**За парты 1 верасня сядуць 86 300 першакласнікаў.**

**Па папярэдняй інфармацыі, колькасць агульнаадукацыйных школ зменшыцца на 52 адзінкі: у краіне зачыняцца 18 пачатковых, 22 базавыя і 4 сярэднія школы.**

**Да новага навучальнага года адкрыюцца 5 новых сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў на 3791 вучнёўскае месца і да канца года — яшчэ 4 сярэднія агульнаадукацыйныя ўстановы на 2348 вучнёўскіх месцаў, у тым ліку ў сталічных мікраараёнах «Каменная Горка-1 і «Дружба-2».**

Казімір Фарыно паведаміў, што ў краіне ўжо некалькі гадоў дзейнічае праграма дзеянняў па павышэнні якасці вывучэння замежных моў, згодна з якой цяпер робіцца націск не на граматычны складнік, а на развіццё камунікатыўных, гутарковых навыкаў і пашырэнне лексічнага запасу. Новыя падручнікі рыхтаваліся менавіта з улікам новага падыходу. «Мы гатовыя і арганізацыйна, і метадычна да ўвядзення трэцяй гадзіны замежнай мовы ў школе, але не варта спадзявацца на хуткі вынік. Для ўсяго патрабуецца час, а для якаснага вывучэння замежнай мовы абавязковая яшчэ матывацыя», — дадаў намеснік міністра.

Ёсць аптымістычная навіна таксама і для настаўнікаў. Іх заробкі абяцаюць павялічыць. Рашэнне аб павышэнні заробкаў настаўнікам цяпер знаходзіцца ва ўрадзе краіны, але да яго падпісання Казімір Фарыно адмовіўся агучыць канкрэтную дату і працэнты павелічэння заробкаў. Як вядома, яшчэ ў ліпені ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі па даручэнні VI з'езда прафсаюза педагагічных работнікаў звярнуўся у Савет Міністраў з просьбай аб пераглядзе памераў заробкаў работнікаў арганізацый адукацыі.

«Нават з улікам штомесячных даплат маладым спецыялістам з кола педагагічных работнікаў у памеры тарыфнай стаўкі першага разраду, устаноўленых з пачатку 2009 года, сярэдняя заработная плата маладога настаўніка складае 490 тысяч рублёў, — падкрэслівалася ў афіцыйным звароце. — Сярэдні памер заработнай платы маладых выкладчыкаў у ВНУ складае 505 тысяч рублёў пры памеры аспіранцкай стыпендыі — 611,7 тысячы рублёў. Павелічэнне тарыфнай стаўкі першага разраду з 1 чэрвеня 2010 года дазволіла ў пэўнай ступені павысіць даходы работнікаў галіны, але не вырашыла сітуацыі, якая склалася ў апошнія гады. Суадносіны сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў адукацыйнай галіны да гэтага паказчыку ў прамысловасці працягваюць зніжацца: з 75,5 працэнта ў 2006 годзе да 68,3 працэнта на сёння».

